ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ГІСТОРЫЯ*

## *HISTORY*

УДК [329.21(476)(091):930.2] «19» Паступіў у рэдакцыю 07.04.2022
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-3-281-288 Received 07.04.2022

**П. А. Трубчык**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ПРАБЛЕМА СТАНАЎЛЕННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ МАНАРХІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст. У ПУБЛІКАЦЫЯХ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАГА ПЕРЫЯДУ

**Аннотация.** Дается анализ дореволюционной историографии монархического движения как части политической истории Беларуси начала XX в. Первым исследователям, насколько это позволяла действительность, удалось собрать и в некоторой степени систематизировать обширный фактический материал о политических организациях правого направления. В то же время анализ работ идеологов и лидеров политических партий дает основание полагать, что в своей основе они имели пропагандистский характер и в первую очередь были направлены на борьбу с политическими противниками.

**Ключевые слова:** белорусские земли, политические партии, монархическое движение, историография, дореволюционный период, Государственная дума

**Для цитирования:** Трубчык, П. А. Праблема станаўлення і дзейнасці манархічных арганізацый на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. у публікацыях дарэвалюцыйнага перыяду / П. А. Трубчык // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2022. – Т. 67, № 3. – С. 281–288. https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2022-67-3-281-288

**Pavel A. Trubchyk**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## THE PROBLEM OF THE FORMATION AND ACTIVITY OF MONARCHICAL ORGANIZATIONS ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE EARLY TWENTIETH CENTURY IN PUBLICATIONS OF THE PRE- REVOLUTIONARY PERIOD

**Abstract.** The article analyzes the pre-revolutionary historiography of the monarchist movement as part of the political history of Belarus in the early twentieth century. The early researchers managed to collect and systematize extensive factual material about right-wing political organizations. At the same time, the analysis of the works of ideologists and leaders of political parties gives reason to believe that they were propagandistic and primarily aimed at fighting their political opponents.

**Keywords:** Belarusian lands, political parties, monarchist movement, historiography, pre-revolutionary period, the State Duma

**For citation:** Trubchyk P. A. The problem of the formation and activity of monarchical organizations on the territory of Belarus in the early twentieth century in publications of the pre-revolutionary period. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2022, vol. 67, no. 3, pp. 281–288 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2022-67-3-281-288

**Уводзіны.** Адным з найбольш уплывовых кірункаў у грамадска-палітычным жыцці на беларускіх землях у пачатку XX ст. з'яўляўся манархічны рух. Праблема яго зараджэння, арганізацыйнага станаўлення і практычнай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў адзначаны перыяд па розных прычынах працяглы час заставалася за межамі ўсебаковага спецыяльнага навуковага вывучэння. Лічылася, што ў Беларусі ў разглядаемы перыяд арганізацыйна афармленага манархічнага руху не існавала. Аднак даследаванні апошніх гадоў сведчаць, што беларускія губерні па ўзроўні кан-

© Трубчык П. А., 2022

цэнтрацыі манархічных плыняў, якія ўзніклі тут у якасці самастойных аддзелаў ці пададдзелаў агульнарасійскіх партый і саюзаў, нават пераўзыходзілі некаторыя губерні ў цэнтры Расіі [1].

Вышэйадзначаная акалічнасць вымушае звярнуцца да гістарыяграфічнага аналізу агульнарасійскіх публікацый, якія маюць непасрэднае дачыненне да прапануемай тэмы навуковага даследавання.

**Асноўная частка.** Дарэвалюцыйная гістарыяграфія манархічнага руху прадстаўлена ў асноўным публіцыстычнымі працамі ідэолагаў розных палітычных плыняў і характарызавалася даволі шырокім спектрам ацэнак праграмных патрабаванняў, стратэгіі і тактыкі.

Першыя спробы вывучэння сутнасці манархічнага руху належаць прадстаўнікам ліберальных і сацыялістычных партый, якія знаходзіліся ў апазіцыі да царскага ўрада. Сярод першых грунтоўных даследаванняў на той час былі працы члена ЦК Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі У. П. Обнінскага, выдадзеныя ў 1906–1913 гг. у Расіі і за мяжой. Асноўную ўвагу аўтар сканцэнтраваў на выкрыцці пагромнай тактыкі крайне правых партый, іх уплыву на мясцовую ўладу і ўрад, а таксама раскрыў шляхі, формы і метады ўзаемадзеяння структур улады з манархічнымі арганізацыямі ў ходзе барацьбы з рэвалюцыйна-дэмакратычным рухам [2, с. 268, 276]. Аднак даследчык не разглядаў прычыны з’яўлення чорных сотняў, іх сацыяльны склад. Разам з тым, прааналізаваўшы лісты былога дырэктара Дэпартамента паліцыі А. А. Лапухіна, адрасаваныя П. А. Сталыпіну, матэрыялы крывавых падзей у Мінску, Гомелі і Беластоку, У. П. Обнінскі прыйшоў да высновы аб значнай ролі царскага ўрада, Дэпартамента паліцыі ў арганізацыі пагромаў у канцы 1905 – пачатку 1906 г. [3, с. 123, 125, 275]. У цэлым, галоўная ўвага ў працах У. П. Обнінскага была сканцэнтравана амаль выключна на адным аспекце – датычнасці (або магчымай датычнасці) правых партый і іх прадстаўнікоў да арганізацыі пагромаў, якія адбыліся ў 1905 г. Асвятленне ім іншых пытанняў таксама адбывалася ў адзначаным кантэксце. Так, характарызуючы сацыяльны склад манархічных партый і арганізацый, ён пісаў, што гэта была ў асноўным «некультурная масса, руководимая авантюристами и политическими убийцами» [2, с. 272]. Відавочна, для аўтара на першы план выступала дзейсная палітычная барацьба, якая ў многім прадвызначыла эмацыянальнае ўспрыманне падзей, відавочцам якіх ён з’яўляўся.

Сярод прац ліберальных аўтараў заслугоўвае ўвагі кніга «Кровавая политика и Белостокский погром». Яе аўтар узгадваецца ў прадмове як «корреспондент одной венской и русской газеты г-н Г...ский» [4, с. 2]. На прыкладзе крывавых падзей у Беластоку ён разглядае агульныя праблемы контррэвалюцыі ў Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. Як і У. П. Обнінскі, аўтар робіць вывад аб датычнасці Дэпартамента паліцыі і Міністэрства ўнутраных спраў да сацыяльных сутыкненняў у канцы 1905 – пачатку 1906 г. і схіляецца да высновы, што менавіта яны накіравалі на гэтыя крывавыя дзеянні чорную сотню.

Для некаторых прац ліберальнага кірунку была характэрна абсалютызацыя залежнасці крайне правых ад царскага ўрада і вярхоў рэакцыйнага дваранства. З’яўленне чарнасоценных груповак і масавых арганізацый разглядаецца ў гэтых даследаваннях як вынік мэтанакіраванай дзейнасці вярхоў самадзяржаўнага рэжыму. Лідар кадэцкай партыі П. М. Мілюкоў расцэньваў з’яўленне крайне правых «погромно-террористических группировок» як спробу рэакцыйных колаў бюракратыі і дваранства пры дапамозе прамога подкупу «темной мещанской массы» знішчыць зараджэнне рускага канстытуцыяналізму [5].

Адзначаная вышэй праблематыка ў асвятленні манархічнага руху ў пачатку XX ст. часткова прысутнічала ў працах А. А. Лукашэвіча, М. Д. Наскова, І. В. Лучыцкага [6–8]. Прадмет даследавання аўтараў быў даволі абмежаваны: І. В. Лучыцкі пісаў аб пагромах, А. А. Лукашэвіч і М. Д. Наскоў – аб правых саюзах. Адначасова імі прадпрымаліся спробы даць класіфікацыю правых партый у структуры расійскай палітычнай сістэмы. Класіфікацыя мела павярхоўны характар. А. А. Лукашэвіч узяў за аснову сацыяльны склад партый і арганізацый. «Саюз рускага народа», «Саюз 17 кастрычніка» і Гандлёва-прамысловая партыя былі аб’яднаны толькі па той прычыне, што ў сваіх шэрагах, на думку аўтара, яны згуртавалі «господствующий класс». М. Д. Наскоў у якасці асноўнага крытэрыю кансалідацыі манархічных сіл вызначыў аднаўленне парадкаў, якія існавалі ў Расіі да 17 кастрычніка 1905 г. Характэрнай асаблівасцю яго даследавання, у адрозненне

ад вышэйпералічаных прац, было тое, што правыя партыі ён не звязваў з дзейнасцю ўрада, а разглядаў як самастойныя арганізацыі.

Характарызуючы публікацыі прадстаўнікоў ліберальнага кірунку, неабходна адзначыць, што ў цэлым у іх знайшлі адлюстраванне агульныя рысы арганізацыі манархічнага руху ў Расіі на пачатковым этапе яго станаўлення. Разам з тым неабходна ўлічваць, што ствараліся гэтыя працы ў перыяд актыўнага ідэалагічнага і практычнага супрацьстаяння паміж markdown рознымі лагерамі. По гэтай прычыне было немагчыма пазбегнуць аднабаковасці ў асвятленні дзейнасці манархічных партый. Аўтары пакінулі за рамкамі сваіх даследаванняў такія важныя пытанні, як прычыны і мэты арганізацыйна-структурнага афармлення правых партый, узаемаадносіны кіраўніцтва цэнтральных організацый з мясцовымі, сацыяльны склад і шэраг іншых.

Спробы навуковага даследавання манархічнага руху ў Расіі былі зроблены ў дакастрычніцкі перыяд меншавіцкімі тэарэтыкамі Ю. В. Мартавым (Ю. В. Цэдэрбаум), У. Мечам (У. Д. Мачынскі), У. Лявіцкім (У. В. Цэдэрбаум), Я. Маеўскім (У. А. Гутоўскі) і Д. Кальцовым (Б. А. Гінзбург).

У кнізе «Политические партии в России», якая выйшла ў выглядзе другога выдання ў 1917 г. (першае з’явілася ў 1906 г.), Ю. В. Мартаў, засноўваючыся на праграмных дакументах і перадвыбарчых заявах, адным з першых прапанаваў сваю класіфікацыю амаль усіх буйнейшых палітычных партый, якія дзейнічалі і на тэрыторыі Беларусі. У прыватнасці, ён вылучыў чатыры групы партый: рэакцыйна-кансерватыўныя, умерана-кансерватыўныя, ліберальна-дэмакратычныя і рэвалюцыйныя [9, с. 5]. Праваманархічным партыям аўтар прысвяціў асобны раздзел «Правые реакционно-консервативные партии», дзе даецца адно з першых іх азначэнняў. У прыватнасці, Ю. В. Мартаў падкрэсліваў, што «консервативные (или правые) партии стоят за сохранение господствующих порядков ... сплошь и рядом добиваются восстановления уже давно исчезнувших учреждений». Такім чынам, на яго думку, правыя з’яўляюцца «...реакционерами (людьми, добивающимися попятного движения истории)» [9, с. 5]. У цэлым погляды Л. Мартава на манархічныя партыі амаль ідэнтычныя з высновамі У. І. Леніна, паколькі ён прымяніў для вызначэння тыпаў партый фактычна той жа «ленинский» класавы падыход. Разам з тым, пазбегнуўшы ў сваёй кнізе прамалінейных, рэакцыйных ацэнак, аўтар змог выявіць і прааналізаваць уплыў грамадскіх класаў на ідэалогію партый, іх праграмы і палітычную дзейнасць.

Праца У. Меча і па сённяшні дзень не страчвае свайго значэння [10]. Аўтар упершыню ў гісторыі вывучэння манархічных партый зрабіў спробу разгледзець працэс іх фарміравання, пагромнатэрарыстычныя метады барацьбы з рэвалюцыйным рухам, удзел у выбарах у Дзяржаўную думу; выявіць даныя аб колькасці манархічных саюзаў; вызначыць іх сацыяльны склад, а таксама даць тлумачэнне, чаму той ці іншы слой грамадства апынуўся на баку контррэвалюцыі. У прыватнасці, ён вылучыў слаі грамадства, якія былі зацікаўлены ў захаванні існуючага ладу. Аналізуючы сацыяльную базу і рухаючыя сілы рэакцыі, аўтар бачыў масавую апору манархічных арганізацый у дробнай гарадской буржуазіі і патрыярхальнай сялянскай масе. На думку аўтара, гэтыя слаі насельніцтва падтрымлівалі крайне правых з прычыны недастатковага ўсведамлення сваіх сацыяльных інтарэсаў, па палітычнай традыцыі, захаванай разам з адсталым тыпам гаспадарання. У. Меч прасачыў уцягванне розных сіл рэакцыі ў контррэвалюцыйны рух у перыяд з 1881 па лістапад 1906 г., аднак у цэлым яго разважанні маюць аглядны характар, даючы толькі агульную карціну, якая патрабуе ўдакладненняў і дапаўненняў.

Праграмныя палажэнні партый манархічнага кірунку разгледзеў вядомы рускі публіцыст, супрацоўнік часопіса «Вестник Европы» Л. З. Слонімскі. Аўтар адзначыў унутраную супярэчлівасць праграмных патрабаванняў крайне правых арганізацый, неадпаведнасць праграмных дэкларацый іх практычнай дзейнасці [11].

Асобнае месца ў гістарыяграфіі правых партый дакастрычніцкага перыяду займаюць працы меншавіцкіх даследчыкаў, якія ўвайшлі ў шматтомны зборнік артыкулаў і нарысаў «Общественное движение в России в начале ХХ-го века», які выдаваўся пад рэдакцыяй меншавіцкіх ідэолагаў Л. Мартава, П. Маслава і А. Патрэсава з 1909 па 1914 г. Найбольшую значнасць для гістарыяграфіі манархічнага руху ў Расійскай імперыі і на беларускіх землях у пачатку ХХ ст. уяўляе падрабязнае даследаванне У. Лявіцкага «Правые партии», якое ўвайшло цэлым раздзелам у пяты вы-

пуск трэцяга тома адзначанага зборніка [12]. Аўтарам упершыню была зроблена спроба перыядызацыі гісторыі манархічнага руху ў гады Першай расійскай рэвалюцыі. Паклаўшы ў аснову палітычныя падзеі, ён вылучыў тры перыяды: 1) ад зараджэння першых арганізацый («Рускі сход», Руская манархічная партыя, «Саюз рускіх людзей») да выдання Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г.; 2) ад 17 кастрычніка 1905 г. да вясны 1906 г. – афармленне «Саюза рускага народа» і з'яўленне асноўнай часткі мясцовых арганізацый; 3) перыяд дзейнасці I і II Дзяржаўных дум – з вясны 1906 па ліпень 1907 г. [12, с. 356–370, 376–389, 404, 444–469]. Засноўваючыся на працы У. Меча, У. Лявіцкі дапоўніў сацыяльную характарыстыку манархічных арганізацый. Ён адзначыў, што ў склад манархічных саюзаў уваходзілі прадстаўнікі рабочых і сялян. Нягледзячы на палемічнасць ацэнак некаторых бакоў манархічнага руху, аўтар даволі абгрунтавана зрабіў выснову, што ён «не был движением, исключительно инсценированным правительством в интересах самозащиты. Наши партии правого лагеря, при всей их зависимости от правительства, не были простым придатком к нему; они представляли различные группы и категории общества, охваченные страхом перед революцией и прибегли к ее методу борьбы – организации своих сил» [12, с. 347–348].

У. Лявіцкі досыць падрабязна спыніўся на праграмных устаноўках такіх арганізацый, як «Рускі сход», Руская манархічная партыя, «Саюз рускіх людзей», надаўшы найбольшую ўвагу «Саюзу рускага народа». Аўтар падкрэсліў, што, нягледзячы на разыходжанні па некаторых пытаннях (напрыклад, стаўленне да Дзяржаўнай думы), гэтыя арганізацыі па асноўных кірунках сваёй дзейнасці былі адзіныя і мелі на мэце галоўнае – падаўленне рэвалюцыі і захаванне манархічнага ладу.

У гэтай жа працы ўпершыню ў дакастрычніцкай гістарыяграфіі манархічнага руху змяшчаюцца звесткі пра наяўнасць аддзелаў правых партый у беларускіх губернях у пачатку XX ст. У ліку першых арганізацый манархічнага кірунку аўтар узгадвае пра існаванне з 1904 г. аддзела «Рускага сходу», а з канца 1905 г. – «Русского вече» ў Вільні [12, с. 358–359]. Тут жа ўзгадваецца пра ўдзел у красавіку 1906 г. дэлегацый Віленскага аддзела «Рускага сходу» і Гомельскага аддзела ўсерасійскай партыі патрыётаў у рабоце першага Усерасійскага з'езда «Саюза рускіх людзей» у Маскве [12, с. 385].

Перыядам найбольшай актыўнасці манархічных арганізацый У. Лявіцкі лічыў 1906 г., звязваючы гэта з утварэннем «Саюза рускага народа» і выхадам яго за межы сталічных цэнтраў. Сярод губернскіх аддзелаў «Саюза рускага народа» ён называе і беларускія: Віцебскі, Магілёўскі і Мінскі. Акрамя таго, прыводзяцца Аршанскі, Гомельскі, Дзвінскі, Бабруйскі, Пінскі і Рэжыцкі павятовыя аддзелы [12, с. 405]. Па сведчанні аўтара, маскоўскі «Саюз рускіх людзей» у адрозненне ад «Саюза рускага народа» меў невялікую колькасць губернскіх аддзелаў, адзін з якіх быў створаны ў Магілёве [12, с. 406]. Разам з прыведзенымі вышэй звесткамі ў нарысе змешчаны фактычны матэрыял пра пагромы ў Гомелі ў студзені 1906 г., а ў чэрвені – у Беластоку (уваходзіў тады ў склад Гродзенскай губерні як павятовы горад), а таксама аб утварэнні і дзейнасці перадвыбарчых камітэтаў правых партый па падрыхтоўцы да выбараў і ў працэсе выбарчай кампаніі ў II Дзяржаўную думу ў гарадах Дзвінску, Магілёве і Мінску [12, с. 431–433]. Такім чынам, прыведзеныя У. Лявіцкім звесткі былі фактычна першымі і адзінымі данымі ў дакастрычніцкай гістарыяграфіі аб наяўнасці, тэрытарыяльным размяшчэнні і практычнай дзейнасці арганізацый манархічнага кірунку на беларускіх землях у гады Першай расійскай рэвалюцыі.

У другім томе вышэйадзначанага зборніка былі змешчаны публікацыі Я. Маеўскага (У. А. Гутоўскі) і Д. Кальцова (Б. А. Гінзбург). Я. Маеўскі ў нарысе «Общая картина движения», нараўне з інфармацыяй пра дзейнасць розных сацыяльна-палітычных сіл напярэдадні і ў ходзе рэвалюцыі 1905–1907 гг., асаблівую ўвагу надаў падзеям восені 1905 г. і прапанаваў сваю класіфікацыю пагромаў з удзелам чарнасоценных арганізацый у працэсе ўсерасійскай палітычнай забастоўкі. Па сутнасці, яго прапановы можна разглядаць як адну з першых спроб сістэматызацыі контррэвалюцыйных дзеянняў манархічных сіл Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. [13].

Артыкул Д. Кальцова «Рабочие в 1905–1907 гг.» змяшчае адметныя даныя пра ўдзел рабочага класа не толькі ў рэвалюцыйна-дэмакратычным, але і ў чарнасоценным руху [14].

Асаблівае месца сярод прадстаўнікоў партый рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера займаюць публікацыі лідара бальшавікоў У. І. Леніна. З сакавіка 1903 па лістапад 1905 г. У. І. Ленін знаходзіўся ў эміграцыі ў Жэневе, таму яго першыя ацэнкі перадрэвалюцыйных падзей і пачатку рэвалюцыі засноўваліся на звестках, атрыманых у асноўным з заходніх газет і часопісаў, якія не заўсёды аб'ектыўна асвятлялі і інтэрпрэтавалі расійскую рэальнасць. Акрамя таго, асноўную ўвагу У. І. Ленін надаваў палеміцы з лідарамі расійскага лібералізму і, відавочна, пакуль не ўспрымаў на дадзеным этапе манархічны рух у якасці сур'ёзнага праціўніка для расійскай сацыял-дэмакратыі ў барацьбе за ўладу, тым больш, што той яшчэ толькі арганізацыйна афармляўся ў самастойную палітычную сілу. Менавіта па гэтай прычыне ён дае даволі спрошчаныя ацэнкі яго ўнутранаму стану, сацыяльнай базы, ідэалогіі і практычнай дзейнасці, уплыву на масы [15].

Пасля падзей восені 1905 г., выбарчай кампаніі ў І Дзяржаўную думу і яе роспуску пазіцыя У. І. Леніна ў дачыненні да манархічнага руху ў Расіі становіцца больш рэальнай і ўзважанай. У верасні 1906 г. друкуецца яго артыкул «Опыт классификации русских политических партий», у якім асноўным крытэрыем вызначэння характару і палітычнай прыналежнасці дзеючых партый і саюзаў, іх тыпалагізацыі быў адназначна акрэслены ў якасці адзіна навуковага класавы падыход. Ён вылучае «...пять основных типов политических партий...», ставячы на першае месца чарнасоценцаў. Аднак у канцы артыкула адзначае, што «черносотенцы образуют последний тип наших политических партий» і выступаюць за захаванне самадзяржаўя [16]. Класавы падыход у вызначэнні сутнасці палітычных партый, у тым ліку і партый манархічнага кірунку, пастаянна ўзгадваецца ў яго працах дакастрычніцкага перыяду [17–20].

Пры ацэнцы ўкладу У. І. Леніна ў гістарыяграфію манархічнага руху пачатку ХХ ст. варта адзначыць, што яго тэрміналогія, класіфікацыя палітычных партый, характарыстыка сацыяльна-класавай сутнасці правых манархічных арганізацый, іх праграмных палажэнняў і ідэалагічных установак прадвызначылі ў далейшым выключна негатыўныя ацэнкі савецкімі даследчыкамі дзейнасці палітычных партый манархічнага кірунку, у тым ліку і на беларускіх землях.

З ленінскімі ацэнкамі партый манархічнага кірунку ў многім супадаюць і погляды іншых прадстаўнікоў бальшавіцкай ідэалогіі, сярод якіх асаблівай увагі заслугоўваюць меркаванні В. В. Вароўскага. У 1907 г. ён апублікаваў артыкул «Социал-демократия и буржуазные партии», дзе звярнуў увагу на працэсы палітычнага самавызначэння дваранства і справядліва адзначаў, што канчатковае афармленне манархічных утварэнняў у палітычныя партыі, у адрозненне ад іншых, адбылося толькі ў канцы 1905 г., дасягнуўшы сваёй актыўнасці ў перыяд работы І Дзяржаўнай думы. Аўтар падкрэсліваў, што арганізацыйнай асновай аб'яднання правакансерватыўных сіл сталі дваранскія сходы. Разам з тым ён адзначаў, што прадстаўнікамі дваранскага саслоўя сацыяльны склад манархічнага руху не вычэрпваецца, што ў склад правых партый уваходзілі разначынцы, частка мяшчанства, купецтва, заможнае і бяднейшае сялянства і нават рабочыя. Яго вывад (у адрозненне ад пазіцыі У. І. Леніна) апраўданы ў тым, што ўзнікненне манархічных, правых партый стала своеасаблівым адказам, рэакцыяй прыхільнікаў традыцыйных форм арганізацыі грамадства на рост рэвалюцыйнасці мас і з'яўленне апазіцыйных самадзяржаўю палітычных партый радыкалаў і лібералаў [21, с. 110–116].

Пэўныя захады да навуковага даследавання правых арганізацый прысутнічаюць у працах вядучых ідэолагаў самога манархічнага руху. Сярод іх неабходна асобна вылучыць чатырохтомнае выданне Л. А. Ціхамірава (займаў пасаду члена савета Галоўнага ўпраўлення па справах друку) «Монархическая государственность», над якім ён працаваў з 1903 па 1906 г. На думку аўтара, манархія як вярхоўная ўлада валодае шэрагам пераваг у параўнанні з іншымі формамі дзяржаўнасці: яна забяспечвае аптымальнае адзінства ўлады як залог яе сілы і моцы; стаіць над прыватнымі інтарэсамі і з'яўляецца найбольш справядлівым суддзёй у сацыяльных канфліктах; валодае высокім кіраўніцкім патэнцыялам (адзінства галін улады, высокая выканаўчая дысцыпліна і г. д.), што забяспечвае магчымасць сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Манархіі, падкрэслівае Л. А. Ціхамірaў, уласціва высокая ступень асабістай адказнасці, яна здольная прыцягваць да ўдзелу ў дзяржаўных справах усе лепшыя сацыяльныя сілы краіны. Рэцэпт жыццяздольнасці манархіі, на яго думку, заключаецца ў спалучэнні самадзяржаўнай вярхоўнай улады, якая грун-

туецца на даверы народа, сінтэзаванай кіраўніцкай сістэме, заснаванай на канвергенцыі манархічнага, дэмакратычнага і арыстакратычнага пачаткаў [22, с. 35–42, 47–58, 76, 92–93]. Шматлікія з гэтых тэарэтычных аргументаў вядомага публіцыста пра перавагі царскага самадзяржаўя былі ўспрыняты лідарамі манархічнага руху ў Расійскай імперыі як неаспрэчныя ісціны і ляглі ў аснову іх ідэалагічных поглядаў.

Да гэтай жа групы публікацый належаць працы кіраўнікоў манархічных партый і саюзаў. Найбольшую цікавасць уяўляе артыкул заснавальніка і лідара Рускай манархічнай партыі У. А. Грынгмута (з'яўляўся яе галоўным рэдактарам), які быў надрукаваны ў 1906 г. у газеце «Московские ведомости», а затым неаднаразова перавыдадзены ў выглядзе брашуры «Руководство черносотенца-монархиста». У ім аўтар зрабіў спробу класіфікаваць палітычныя партыі, якія выступалі супраць захавання самадзяржаўнага ладу. Да іх ён аднасіў канстытуцыяналістаў, дэмакратаў, сацыялістаў, рэвалюцыянераў і анархістаў [23]. У брашуры былі выкладзены галоўныя ідэалагічныя пастулаты правых сіл. Па сутнасці, яна стала настольнай кнігай для кожнага ўдзельніка манархічнага руху.

Сярод іншых прац лідараў правых партый неабходна адзначыць кнігу заснавальніка (разам з мастаком А. А. Майкавым) і старшыні «Саюза рускага народа» А. І. Дубровіна «Куда временщики ведут Союз Русского Народа». У ёй лідар манархістаў надаваў асноўную ўвагу палеміцы з апанентамі (мірнаабнаўленцамі) па важнейшых пытаннях стратэгіі і тактыкі партыі, абвінавачваючы іх у адмове ад традыцыйных пачаткаў рускага манархічнага руху [24].

У кантэксце адзначанай літаратуры заслугоўвае ўвагі зборнік манархіста, дэпутата Дзяржаўнай думы III і IV скліканняў, старшыні галоўнага савета «Саюза рускага народа» (з 1910 г.) М. Я. Маркава (Маркаў II) «Войны темных сил. Статьи. 1921–1937» [25]. Праца была апублікавана ў 1928 і 1930 гг. у Парыжы. У Расіі ў поўным аб'ёме яна выдадзена ў 2002 г. Аўтар аналізуе прычыны пагромаў у 1905 г. і прыходзіць да высновы, што яны былі непасрэдным вынікам рэвалюцыі, адказам патрыятычнай часткі насельніцтва на тэрор і экспрапрыяцыі з боку леварадыкальных, экстрэмісцкіх сіл, якія імкнуліся звергнуць існуючы лад, рэалізаваць такім чынам ідэі заходніх сацыялістаў і міжнароднага сіянізму [25, с. 138–139]. Аналізуючы дзейнасць сваёй партыі і яе ролю ў захаванні традыцыйных асноў рускага грамадства ў гады рэвалюцыйных падзей, М. Я. Маркаў асабліва падкрэсліваў, што «...Союз русского народа в первые годы своего существования сыграл большую историческую роль и помог государственной власти, которая была ослаблена борьбой с темной силой, победить революцию 1905–1907 гг. ...Одновременно быстро пошла на спад волна террора и грабежей, которая заливала Россию кровью и бедствиями» [25, с. 145–146]. Таксама ўяўляе цікавасць яго артыкул «Ответ монархиста», які быў напісаны падчас знаходжання М. Я. Маркава ў эміграцыі і змешчаны ў вышэйназваным выданні. У дыскусіі з апанентам з парыжскай газеты «Последние новости» Борухам Мірскім ён адзначаў, што «история не знает республиканской России, а знает только Россию-монархию ...И вот эту живую, единственно бывшую в реальности Россию мы, монархисты, любим, ей мы преданы, по ней скучаем. Нам скажут, что мы все же ошибаемся, но ведь эту «ошибку» на протяжении целой тысячи лет совершал весь русский народ. Или, может быть, само существование России надо считать ошибкой» [25, с. 370, 372]. З пункта гледжання сучасных гістарычных рэалій можна не пагаджацца з вышэйадзначанай пазіцыяй вядомага рускага манархіста, але яго вернасць сваім ідэалам з улікам рэалій таго часу, безумоўна, заслугоўвае ўвагі.

**Высновы.** Такім чынам, неабходна адзначыць, што дарэвалюцыйная гістарыяграфія адрозніваецца залішняй палітызаванасцю і публіцыстычнасцю. Аналіз прац ідэолагаў і лідараў манархічнага руху дае падставу лічыць, што ў сваёй аснове яны мелі прапагандысцкі характар. Тым не менш у іх прысутнічаюць першыя ацэнкі падзей пачатку XX ст., змяшчаецца даволі грунтоўны фактычны матэрыял, які дазваляе разглядаць іх як гістарычныя крыніцы, што ўяўляюць пэўную гістарыяграфічную каштоўнасць.

Што тычыцца прац аўтараў, якія належалі да сацыялістычнага і ліберальнага лагераў, то яны, хоць і маюць пэўную гістарыяграфічную цікавасць, усё ж былі скіраваны на барацьбу са сваімі палітычнымі праціўнікамі і па гэтай прычыне аказаліся далёкімі ад навуковай аб'ектыўнасці. Ім уласцівы апісальны характар, палемічная вастрыня і катэгарычнасць ацэнак. Як правіла, га-

лоўныя пытанні дзейнасці манархічных партый на беларускіх землях толькі абазначаны і падаюцца ў аднабаковым парадку, што з цягам часу лягло ў аснову традыцыйных выкрывальніцкіх адносін да асвятлення стратэгіі і тактыкі прыхільнікаў самадзяржаўя. Да іх недахопаў варта таксама аднесці адсутнасць навукова-даведачнага апарату, што не дазваляе вызначыць кола і дакладнасць крыніц, якімі карысталіся аўтары. Тым не менш першым даследчыкам, наколькі гэта дазваляла рэчаіснасць, удалося сабраць і ў некаторай ступені сістэматызаваць шырокі фактычны матэрыял аб палітычных арганізацыях правага кірунку і закласці фундамент для далейшага ўсебаковага навуковага даследавання гісторыі манархічнага руху ў пачатку XX ст.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Кирьянов, Ю. И. Численность и состав крайних правых партий в России (1905–1917 гг.): тенденции и причины изменений / Ю. И. Кирьянов // Отеч. история. – 1999. – № 5. – С. 29–43.

2. Обнинский, В. П. Новый строй : [в 2 ч.] / В. П. Обнинский. – М. : Тип. Рус. Т-ва печат. и изд. дела, 1909. – Ч. 1 : Манифесты 17 октября 1905 г. – 8 июля 1906 г. – 361 с.

3. Обнинский, В. П. Последний самодержец: очерк жизни и царствования императора в России Николая II / В. П. Обнинский ; под ред. С. С. Волка. – М. : Республика, 1992. – 287 с.

4. Г...ский, В. Кровавая политика и Белостокский погром / [В. Г...ский (кор. одной вен. и рус. газет)]. – [М.] : Рус. свобод. изд-во, 1906. – 143 с.

5. Милюков, П. Н. Воспоминания (1859–1917) : [в 2 т.] / П. Н. Милюков ; [сост. М. Г. Вандалковская]. – М. : Современник, 1990. – 2 т.

6. Лукашевич, А. А. Наши враги: сравнительный очерк правых партий / А. А. Лукашевич. – СПб. : Товарищ, 1906. – 31 с.

7. Носков, Н. Д. Охранительные и реакционные партии в России : очерк / Н. Д. Носков ; под ред. И. И. Иванюкова. – 2-е изд. – СПб. : Тип. С. М. Проппера, 1906. – 64 с. – (Политическая библиотека «Биржевых ведомостей» ; вып. 50).

8. Речи по погромным делам : [в 2 вып.]. – Киев : Тип. С. Г. Слюсаревского, 1908. – Вып. 1 : Речи и заявления прис. пов. П. А. Андреевского, М. В. Беренштама, М. М. Винавера [и др.] / предисл. И. В. Лучицкого. – VI, 150 с.

9. Мартов, Л. Политические партии в России / Л. Мартов. – 2-е изд. – М. : Рус. печатня, 1917. – 36 с.

10. Меч, В. Силы реакции / В. Меч // Борьба общественных сил в русской революции : [в 4 вып.] / Вл. Горн, В. Меч, Череванин [псевдонимы]. – М., 1907. – Вып. 1. – С. 9–100.

11. Слонимский, Л. Наши «монархисты» и их программы / Л. Слонимский // Вестн. Европы. – 1907. – Т. 3, кн. 5. – С. 255–272.

12. Левицкий, В. Правые партии / В. Левицкий // Общественное движение в России в начале XX-го века : [в 4 т.] / под ред. Л. Мартова, П. Маслова, А. Потресова. – СПб., 1914. – Т. 3, кн. 5. – С. 347–469.

13. Маевский, Е. Общая картина движения / Е. Маевский // Общественное движение в России в начале XX-го века : [в 4 т.] / под ред. Л. Мартова, П. Маслова, А. Потресова. – СПб., 1910. – Т. 2, ч. 1. – С. 34–184.

14. Кольцов, Д. Рабочие в 1905–1907 гг. / Д. Кольцов // Общественное движение в России в начале XX-го века : [в 4 т.] / под ред. Л. Мартова, П. Маслова, А. Потресова. – СПб., 1910. – Т. 2, ч. 1. – С. 185–339.

15. Ленин, В. И. Предисловие к брошюре «Докладная записка директора Департамента полиции Лопухина» / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : [в 55 т.]. – Изд. 5-е. – М., 1960. – Т. 9 : Июль 1904 – март 1905. – С. 331–334.

16. Ленин, В. И. Опыт классификации русских политических партий / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : [в 55 т.]. – Изд. 5-е. – М., 1960. – Т. 14 : Сентябрь 1906 – февраль 1907. – С. 21–27.

17. Ленин, В. И. Открытие второй Государственной думы / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : [в 55 т.]. – Изд. 5-е. – М., 1961. – Т. 15 : Февраль – июнь 1907. – С. 19–22.

18. Ленин, В. И. Политические партии за 5 лет Третьей думы / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : [в 55 т.]. – Изд. 5-е. – М., 1961. – Т. 21 : Декабрь 1911 – июль 1912. – С. 167–172.

19. Ленин, В. И. Политические партии в России / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : [в 55 т.]. – Изд. 5-е. – М., 1961. – Т. 21 : Декабрь 1911 – июль 1912. – С. 275–287.

20. Ленин, В. И. О черносотенстве / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : [в 55 т.]. – Изд. 5-е. – М., 1961. – Т. 24 : Сентябрь 1913 – март 1914. – С. 18–19.

21. Воровский, В. В. Социал-демократия и буржуазные партии / В. В. Воровский // Избранные произведения о первой русской революции / В. В. Воровский. – М., 1955. – С. 104–140.

22. Тихомиров, Л. А. Монархическая государственность / Л. А. Тихомиров. – М. : Облиздат : Алир, 1998. – 671 с.

23. Грингмут, В. А. Руководство черносотенца-монархиста / В. А. Грингмут. – 2-е изд. – М. : Верность, 1911. – 15 с.

24. Куда временщики ведут Союз русского народа / [сост. А. И. Дубровин]. – СПб. : Отеч. тип., 1910. – 616 с.

25. Марков, Н. Е. Войны темных сил : [статьи, 1921–1937] / Н. Е. Марков. – [Репр. изд.]. – М. : Журн. «Москва», 2002. – 521 с.


## References


1. Kir'yanov Yu. I. The number and composition of the extreme right parties in Russia (1905–1917): trends and causes of change. *Otechestvennaya istoriya* [National history], 1999, no. 5, pp. 29–43 (in Russian).

2. Obninskii V. P. *Manifestos October 17, 1905 – July 8, 1906. Pt. 1.* Moscow, Printing house of the Russian Association of Printing and Publishing, 1909. 361 p. (in Russian).

3. Obninskii V. P., Volk S. S. (eds.). *The last autocrat: an essay on the life and reign of emperor Nicholas II in Russia*. Moscow, Respublika Publ., 1992. 287 p. (in Russian).

4. G…skii V. *Bloody politics and the Bialystok pogrom*. Moscow, Russkoe svobodnoe izdatel'stvo Publ., 1906. 143 p. (in Russian).

5. Milyukov P. N., Vandalkovskaya M. G. (et al.). *Memories (1859–1917).* Moscow, Sovremennik Publ., 1990. 2 vol. (in Russian).

6. Lukashevich A. A. *Our enemies: a comparative essay on the right-wing parties*. St. Petersburg, Tovarishch Publ., 1906. 31 p. (in Russian).

7. Noskov N. D., Ivanyukov I. I. (eds.). Protective and reactionary parties in Russia: an essay. *Politicheskaya biblioteka Birzhevykh vedomostei. Vyp. 50* [Political Library of Birzhevye Vedomosti. Iss. 50]. 2nd ed. St. Petersburg, Tipografiya S. M. Proppera Publ., 1906. 64 p. (in Russian).

8. *Speeches on pogroms. Iss. 1. Speeches and statements pov. P. A. Andreevsky, M. V. Berenshtam, M. M. Vinaver and others*. Kyiv, 1908. 150 p. (in Russian).

9. Martov L. *Political parties in Russia*. 2nd ed. Moscow, Russkaya pechatnya Publ., 1917. 36 p. (in Russian).

10. Mech V. Reaction forces. *Bor'ba obshchestvennykh sil v russkoi revolyutsii. Vyp. 1.* [The struggle of social forces in the Russian revolution. Iss. 1]. Moscow, 1907, pp. 9–100 (in Russian).

11. Slonimskii L. Our «monarchists» and their programs. *Vestnik Evropy* [Herald of Europe], 1907, vol. 3, bk. 5, pp. 255–272 (in Russian).

12. Levitskii V. Right parties. *Obshchestvennoe dvizhenie v Rossii v nachale XX-go veka* [Social movement in Russia at the beginning of the 20th century]. St. Petersburg, 1914, vol. 3, bk. 5, pp. 347–469 (in Russian).

13. Maevskii E. General picture of movement. *Obshchestvennoe dvizhenie v Rossii v nachale XX-go veka* [Social movement in Russia at the beginning of the 20th century]. St. Petersburg, 1910, vol. 2, pt. 1, pp. 34–184 (in Russian).

14. Kol'tsov D. Workers in 1905–1907. *Obshchestvennoe dvizhenie v Rossii v nachale XX-go veka* [Social movement in Russia at the beginning of the 20th century]. St. Petersburg, 1910, vol. 2, pt. 1, pp. 185–339 (in Russian).

15. Lenin V. I. Preface to the brochure «Memorandum of the Director of the Police Department Lopukhin». *Polnoe sobranie sochinenii. T. 9* [Full composition of writings. Vol. 9]. 5th ed. Moscow, 1960, pp. 331–334 (in Russian).

16. Lenin V. I. The experience of classifying Russian political parties. *Polnoe sobranie sochinenii. T. 14* [Full composition of writings. Vol. 14]. 5th ed. Moscow, 1960, pp. 21–27 (in Russian).

17. Lenin V. I. Opening of the second State Duma. *Polnoe sobranie sochinenii. T. 15* [Full composition of writings. Vol. 15]. 5th ed. Moscow, 1961, pp. 19–22 (in Russian).

18. Lenin V. I. Political parties in 5 years of the Third Duma. *Polnoe sobranie sochinenii. T. 21* [Full composition of writings. Vol. 21]. 5th ed. Moscow, 1961, pp. 167–172 (in Russian).

19. Lenin V. I. Political parties in Russia. *Polnoe sobranie sochinenii. T. 21* [Full composition of writings. Vol. 21]. 5th ed. Moscow, 1961, pp. 275–287 (in Russian).

20. Lenin V. I. About the Black Hundreds. *Polnoe sobranie sochinenii. T. 24* [Full composition of writings. Vol. 24]. 5th ed. Moscow, 1961, pp. 18–19 (in Russian).

21. Vorovskii V. V. Social Democracy and Bourgeois Parties. *Izbrannye proizvedeniya o pervoi russkoi revolyutsii* [Selected works about the first Russian revolution]. Moscow, 1955, pp. 104–140 (in Russian).

22. Tikhomirov L. A. *Monarchic statehood*. Moscow, Oblizdat Publ., Alir Publ., 1998. 671 p. (in Russian).

23. Gringmut V. A. *Leadership of the black hundred monarchist*. 2nd ed. Moscow, Vernost' Publ., 1911. 15 p. (in Russian).

24. Dubrovin A. I. (comp.). *Where the temporary workers are leading the Union of the Russian people*. St. Petersburg, Otechestvennaya tipografiya Publ., 1910. 616 p. (in Russian).

25. Markov N. E. *Dark Forces Wars: articles, 1921–1937.* Repr. ed. Moscow, Zhurnal "Moskva" Publ., 2002. 521 p. (in Russian).

## Информация об авторе

**Трубчик Павел Анатольевич** – кандидат исторических наук, доцент. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: trubchik.p@mail.ru

## Information about the author

**Pavel A. Trubchyk** – Ph. D. (Hist.), Associate Professor. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: trubchik.p@mail.ru